ПЕСНІ ДЛЯ МАТУЛІ

Са старымі вясковымі музыкантамі адыходзіць эпоха самабытнай народнай культуры. Некалі гарманісты весялілі аднавяскоўцаў на вячорках, маёўках, кірмашах і фэстах, вяселлях і провадах у армію. Амаль у кожнай вёсцы быў свой, як раней казалі, «музыканцік», а калі не было — запрашалі альбо наймалі з суседняй вёскі. У песнях і танцах жыве народная душа.

Дзе тыя «першыя хлопцы на сяле» — народныя таленты, самабытныя вясковыя віртуозы, самародкі ігры на двухрадках? У якіх скрынях і шафах схаваны іхнія інструменты? На жаль, нам застаецца толькі ўспамінаць таленавітых вясковых музыкантаў...

Час ад часу я сустракаю саматужных гарманістаў з вёскі ў гарадскім асяродку. Урбанізацыя не «ўтаймавала» іхні талент, па-ранейшаму яны не страцілі вострае пачуццё народнай музыкі. Адзін з такіх — Уладзімір Паўловіч — былы мінскі жыхар, які дванаццаць гадоў таму вярнуўся на малую радзіму ў вёску Лозкі Навагрудскага раёна. Вярнуўся са сваім сябрам-спадарожнікам — гармонікам. Найгрышамі і песнямі ён весяліць сваю старэнькую маці. Па прафесіі сталяр мінскага вагоннага дэпо і завода «Гарызонт», ён ніколі не кідаў любімы занятак, удзельнічаў у конкурсах «Іграй, гармонік!». Цяпер Уладзімір Аляксеевіч — адзіны на ўвесь раён традыцыйны гарманіст, які ведае ўсе даўнейшыя танцы, народныя песні. Таму я і вырашыў запісаць яго ўспаміны і жывую музыку на відэа, зрабіць фотасесію ў родным доме і ў вясковых ваколіцах. ***На сайце zviazda.by можна паслухаць полькі, вальсы і іншыя танцавальныя мелодыі ў яго выкананні, паглядзець больш здымкаў і даведацца пра музычную «кар'еру» вясковага музыканта.***

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.